## Уладзімір Сітнік



Палажэвічы, Палажэвічы
Над Даколькаю, ціхай ракой.
Тут народ жыве, жыта сеючы
І дзяцей вучыць добра ўмеючы,
І гульнуць, калі трэба—Бог мой!
Палажэвічы, Палажэвічы,
Прыгажэй для мяне няма вас.
Вы вясной у садах квітнеючы,
А ў жніўні, ад золата млеючы,
Сустракаеце яблычны спас.
Палажэвічы, Палажэвічы,
У старонцы чароўнай, лясной
Вы жывіце, заўжды маладзеючы
І шчаслівыя песні пеючы,
Ганарыцеся доляй сваёй.
Палажэвічы, Палажэвічы,
Мне пра вас не спяваць немагчыма.
Палажэвічы, Палажэвічы,
Вы часцінка любімай Радзімы…

*****

Ясныя зоры, чыстыя росы
Спеў жаўрука над зямлёй.
Мы ─ Крываносы,
Мы з Крываносаў,
З школы сярэдняй сваёй.
Мы без  панукі глыбы навукі
Дробім, нібы дынаміт.
Толькі задачы пачэсней не ібачым,
Вырасці трэба людзьмі.
Гімн узнімайся наш да нябёсаў,
Звонка звіні над зямлёй.
Мы ─ Крываносы,
Мы з Крываносаў,
З школы сярэдняй сваёй.

*****

Вы скажаце, чаму так,
У чым тут прычына,
Што людзі не любяць
Дрыготкіх асінак.
Нібы гэтае дрэўца
Пад нейкім праклѐнам,
І няма яму месца
Сярод ліпак і клѐнаў.
А чаму? Што заўсѐды,
Ці то ўдзень, ці пад вечар,
У любое зацішша
Яна ўся трапеча.
Калі нават дыхнеш ты
Асцярожна, употай,
Зашапоча асінка
Сваѐю лістотай.
Перад чорнаю бурай
Трывожнаю ноччу
Дрэўца кожным лісточкам
З усіх сіл заляскоча,
Быццам хоча яно
Ўвесь лес папярэдзіць:
-Сцеражыцеся буры,
Дарагія суседзі!
Я люблю гэта дрэўца,
Заўжды трапяткое,…
Каб у кожнага сэрца
Было вось такое.
Пры бядзе чалавечай
Каб заўжды трапятала,
Дык, напэўна б, і гора
На свеце не стала..

*****

**Сустрэча з выпускнікамі**

Я сягоння сустрэўся з юнацтвам,
Больш прыемнай падзеі няма,
І павінен вам шчыра прызнацца:
Маладзейшым адчуў сябе я.
Бы хвароб аніякіх, ні пенсій,
І ніякіх сівых валасоў.
Ля кастра камсамольскія песні
Заспяваць разам з вамі гатоў.
І хоць сѐння вам 30 ці 40,
А па мне вам сямнаццаць ўсяго.
І цяпло вашых поглядаў-зорак
Саграваe, бы ўзімку агонь.
І хоць колькі гадоў ні пражыў бы
(А сягоння няпроста ўсім жыць),
І хоць помняцца школьныя крыўды,
Школу будзем заўсѐды любіць.
З асаблівай пяшчотай, любоўю,
Дарагія сябры, вам усім
І багацця, і шчасця, й здароўя
Я жадаю як родным сваім.

*****

**Прызнанне**

Мне, ей-богу, нічога не трэба,
Вам прызнаюся шчыра я,
Толькі бездань блакітнага неба,
Клѐкат бусла і звон ручая,
Бохан роднага смачнага хлеба,
І ўсмешка, як сонца, твая,
Шэпат лесу гаюча нястрымны
І прасторы палѐў неабдымных—
Усѐ што клічам мы любай Радзімай.

*****

**Веснавік**

Стаў меншы ростам снегавік.
Як нос яму тут не павесіць!
З яго смяецца сакавік,
Вясновы, светлы, яркі месяц.
    І ноччу, хоць яшчэ мароз,
    І кружаць вальс яшчэ сняжынкі,
    І між сярэбраных бяроз
    Такія звонкія сцяжынкі.
Ды днём усѐ вышэй блакіт,
Усѐ смялей смяецца сонца,
І ўжо спрабуюць ручайкі
Свой бег на снегавой лясѐнцы.
    Вясна ідзе, і не спыніць
    Яе нікому ўжо, паверце,
    Яна ўсѐ радасней звініць
    І на дварэ, і ў нашых сэрцах.
Усѐ мацнее сакавік,
Усѐ спрытней снягі ѐн косіць,
Ён, гэты месяц,- веснавік,
Бо ѐн вясну з сабой прыносіць.

*****

**Зноў вясна**

Зноў вясна, і пад ліўнямі цѐплымі
Абмывае зямелька свой твар,
І зусім нечакана на поплаве
Расплюскаўся зялѐны пажар.
Сталі светлымі далі, вясѐлымі,
Над рачулкай лісточкі ракіт
Язычкамі зялѐнага полымя
Ліжуць сонечна чысты блакіт.

**Дзяўчыне з цыгаркай**
Якім чароўна русакосым
Цвіце дзявочае юнацтва!
Ды шмат з цыгаркаю пад носам
Дзяўчатак. Гэта ж як вар'яцтва!
Час праляціць нябачнай куляй,
І стане дзеўчына матуляй
Ды скажа, пэўна: "Мая дзетка,
Смакчы не соску—цыгарэтку…"
***
Як любіў калісьці спорт,
Дык здаровы быў, як чорт.
Як гарэлку ўпадабаў,
Сам за чорта цяпер стаў.
***
Ой ты, п'яненькі вадзіла,
Для цябе ўжо не сакрэт:
Дзе гарэлка і "чарніла",
Там кювет і лазарэт.
***
Стала моднай наша Міла:
Нос і шчокі з просінню,
Бо купаецца ў "чарніле"
І вясной, і восенню.
***
Ой, гарэлачка, ты булькай…
Як цябе не шанаваць?!
Мне шчэ 30, а бабулькі
Месца сталі саступаць.
***
Няма грошай на бутэльку—
Браць на вэксаль не люблю.
Злажу к дзеду ў камізэльку,
Сабе пляшачку куплю.
***
Ой, нялѐгкую задачу
Задала сама сабе:
Куды ж мілага цягнуць мне
Перш у ЗАГС ці ЛТП?

***

За ім, лысым, крывапятым,
Гужам бегаюць дзяўчаты,
Бо адзіны ѐн “хадок”
На ўвесь аграгарадок:
Той дасць кветачак з бахілаў,
Той - бутэлечку “чарнілак”,
З той патанчыць, з той пакурыць…
І, вядома, усіх абдурыць,
Бо сягоння дужа ж модна
У каханні быць свабодным…
І няма чамусьці “пугі”
Для такога вось спрытнюгі!

***

**Аб модзе**

О, мода! З кожным годам ты смялей
Падол кароціш у сукенцы.
З табой не спору - сэрцу весялей,
Калі відаць дзявочыя каленцы.
Калі ж кабета ў сорак пяць
У міні валюхае цяжкім ходам,
Я не магу тады не закрычаць:
- Памры і не ўваскрэсні, мода!

***

**Роздум**

Што такое вада, зразумець можна
толькі ў пустыні.
Што такое святло і паветра—
у цвілым падзямеллі,
Што такое свабода -
за кратамі з дротам калючым.
Як шкада і балюча,
што мы разумець пачынаем,
Што такое матуля, ля ўзгорачка
з жоўтага жвіру,
Пад крыжам, што пахне жывіцай.

***

**Дачцэ**

Ты не будзь крапівою
Заўсѐды пякучай і злоснай,
Бо ніхто не падыдзе к табе,
Абміне, хмура кінуўшы вокам.
Ты рамонкам не будзь
Сарамлівым і ціхім,
Бо любы цябе зможа пакрыўдзіць,
Без развагі сарве і затопча.
Будзь, дзяўчынка мая,
Ты калючаю ружай,
Каб схіліўся к табе
Толькі мужны і дужы.

***

**Зязюля**

Колькі дзіў бывае па вясне!
З гарадскога неспакою вуліц
Ты ў гай паклікала мяне
Пагадаць на шчасце ў зязюлі.
Неслася чароўнае “ку-ку”,
Шмат гадоў зязюлька нам лічыла.
Я нясмела ўзяў тваю руку,
Ты мне пацалунак падарыла.
І пабегла. Знікла ў сасняку…
Толькі бліснула каса маланкай.
Але што за дзіўнае “ку-ку”
Зазвінела раптам над палянкай.
Хочаш вер ты гэтаму, не вер -
Здарылася цуда, нібы ў казцы.
Мы “ку-ку” не слухаем цяпер,
Бо звініць “куга-куга” ў калясцы.

***

**Рамонкі**

Юнак спяшаецца рамонкі
Каханай падарыць хутчэй.
І я заўважыў, як у жонкі
Слязінкі пырснулі з вачэй.

Яна прыпомніла, напэўна,
Як я калісьці юнаком
Мог прастаяць да трэціх пеўняў
З букетам кветак пад акном.

І звышцікаўныя суседкі
Гадалі доўга на сяле –
Адкуль найлепшыя ўсе кветкі
Ў цябе бяруцца на стале?..

А колькі той парою слаўнай
Пяшчотных выказана слоў!
Здаецца, гэта так нядаўна
Было. Чаму, чаму было?

Няўжо не маюць права жонкі
На кветкі—прыгажосць вясны,
І не рамонкі, а пялѐнкі
Патрэбна ведаць ім адны.

О, каб вярнуць, здаецца, зноўку
Той дзіўны час, сваю вясну!
Прабач мяне, мая сяброўка,
І я яе вярну.

Вярну і песняю нязвонкай,
Усплескам хвалі і вясла,
І сарамліваю рамонкай,
Што ўжо ў лузе расцвіла.

Няхай не будзе больш слязінак
У родных жончыных вачах.
Мужчыны, чуеце, мужчыны,
Цвітуць рамонкі ў лугах!

***

**Маці**

Ноч плыве над сялом.
Ды табе ў адзіноце не спіцца.
Ты сядзіш ля акна
І калышаш аб сыне нуду.
І ці веснічкі скрыпнуць,
І ці стукне ў сцяну аканіца—
Усё здаецца табе –
Гэта я на пабыўку іду.
Страпянешся, як птушка,
Ды ўсё ціха кругом і нікога,
Толькі ў полі далёкім
Мерны гул трактароў…
А назаўтра з парога
Ты падоўгу глядзіш на дарогу,
Па якой я на службу
Тым жнівеньскім раннем прайшоў.
І хвалюешся шмат,
Як табе я не ў тэрмін
(Прабач, мамка, за гэта)
Свой лісток напішу.
Ты хвалюешся так,
Што тады нават працай на ферме
Аніяк ты не зможаш
Суцешыць душу.
Я стаю на граніцы,
Дзе туманы спляліся,
Каб ніхто не парушыў
Радзімы спакой.
Не сумуй жа па мне,
А здалёк усміхніся
Цёплай, любай, пяшчотнай
Усмешкай сваёй.
Я вярнуся вясною
Ў родную хату,
Расцалую цябе,
Пакланюся да самай зямлі.
А пакуль… пачакай,
Бо чаканне матуль

Так патрэбна салдатам,
Дзе б яны ні служылі,
Дзе б яны ні былі.